ДЭПАРТАМЕНТ ПА АРХІВАХ І СПРАВАВОДСТВУ
МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

# Гербоўнік беларускай шляхты

ТОМ 8
Частка 1

# К

(Каборды – Карэцкія)

Мінск
«Беларусь»
2022

УДК 929.5/.6(476)
ББК 63.2(4 Беи)
Г37

Рэкамендавана да друку Вучоным саветам
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

А ў т а р ы:
*Я. С. Глінскі* (кіраўнік), *Д. Ч. Матвейчык, Ю. М. Снапкоўскі*

Н а в у к о в ы р э д а к т а р:
прафесар, доктар габілітаваны *А. Рахуба*

Р э д к а л е г і я:
*Д. У. Яцэвіч* (старшыня), *Р. С. Жаўняркевіч, В. І. Кураш*,
*Д. В. Лісейчыкаў*, *А. Я. Рыбакоў*

Р э ц э н з е н т ы:
доктар гістарычных навук *В. Ф. Голубеў*,
кандыдат гістарычных навук *В. С. Макарэвіч*

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы*
*Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

**Г37** **Гербоўнік беларускай шляхты.** Т. 8, ч. 1. К (Каборды – Карэцкія) / Я. С. Глінскі [і інш.] ; навук. рэд. А. Рахуба. – Мінск : Беларусь, 2022. — 927 с. : [24] л. іл.

ISBN 978-985-01-1508-9

Кніга – працяг шматтомнага выдання, распачатага ў 2002 г. У першай частцы восьмага тома «Гербоўніка беларускай шляхты» пададзена 224 радаводы шляхты пераважна Мінскай губерні з прозвішчамі на літару «К» (ад «Каборды» да «Карэцкія»), складзеныя на падставе матэрыялаў фонду Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу.

Прызначаецца для шырокага кола чытачоў – прафесійных навукоўцаў, а таксама аматараў генеалогіі і геральдыкі, краязнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй.

**УДК 929.5/.6(476)**
**ББК 63.2(4 Беи)**

**ISBN 978-985-01-1508-9**

© Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі», 2022
© Афармленне. УП «Выдавецтва «Беларусь», 2022

# ПРАДМОВА

Першая частка восьмага тома «Гербоўніка беларускай шляхты» (далей – «Гербоўнік»), выпушчаная **Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі** сумесна з **выдавецтвам «Беларусь»**, уключае радаводы шляхты, якая пераважна пражывала на тэрыторыі Мінскай губерні і мела прозвішчы, што пачыналіся на літару «К» (да прозвішча «Карэцкія» ўключна). Гэтая кніга працягвае шматтомнае выданне, якое пачалося ў 2002 г. і з таго часу выклікае трывалую цікавасць як у асяроддзі навуковай грамадскасці, так і ў генеалогаў-аматараў.

Змешчаныя ў «Гербоўніку» звесткі дазваляюць прасачыць на прыкладзе асобных родаў змяненні ў сацыяльным статусе, грамадска-палітычнай ролі, маёмасным становішчы шляхты беларускіх зямель на працягу XVI – пачатку XX ст. Гэта дастаткова працяглы прамежак часу, у які беларускія землі ўваходзілі ў склад розных дзяржаў (Вялікае Княства Літоўскае, Рэч Паспалітая, Расійская імперыя). Апрача таго, у гэты час адбываліся фундаментальныя сацыяльныя ператварэнні, якія не маглі не закрануць шляхецкае саслоўе. У такім рэчышчы публікацыя «Гербоўніка» атрымлівае практычнае вымярэнне не толькі для генеалагічных і звязаных з імі прац, але таксама для шырокага кола навуковых даследаванняў.

* * *

Зборнік «Гербоўнік беларускай шляхты» грунтуецца пераважна на комплексе дакументаў, які ўтварыўся ў канцы XVIII – XIX ст. у выніку ажыццяўлення расійскімі ўладамі «разбору шляхты». Падчас яго шляхецкія роды павінны былі рабіць вывады – падаваць доказы, якія пацвярджалі б іх даўнюю, на працягу многіх пакаленняў, прыналежнасць да вышэйшага саслоўя. Аднак практыка вывада шляхецтва не была незнаёмай для жыхароў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Ужо Статут ВКЛ 1529 г. прадугледжваў, што ў выпадку, калі кагосьці абвінавацяць у прысвойванні шляхецкай годнасці, ён павінен прадставіць двух сведкаў, якія засведчылі бы яго паходжанне па лініі бацькі і маці. Справы аб прысвойванні («нагане») шляхецтва не былі рэдкасцю, многія з іх захаваліся ў складзе Метрыкі ВКЛ.

Асабліва шмат вывадаў шляхецтва адбывалася падчас правядзення «валочнай памеры» ў 1550–1560-я гг. Пры ўдакладненні меж дробныя землеўладальнікі маглі быць пазбаўлены валоданняў у выпадку, калі яны не маглі прадставіць дакументы, якія пацвярджалі іх шляхецтва. Гэта прымушала іх падаваць гаспадарскім службоўцам доказы, якія вызначалі іх саслоўную прыналежнасць і валоданні. Напрыклад, Канстовічы з Цельшаўскай вола-

сці Жамойцкага княства падалі ў падмацаванне шляхецкіх правоў на зямлю прывілей вялікага князя літоўскага Жыгімонта і ліст кашталяна віленскага Яна Кязгайлы. Выдадзены гаспадарскімі камісарамі ў 1565 г. ліст з апісаннем валоданняў Канстовічаў неспадзявана стаў у XVIII ст. падставай для афармлення легенды роду. Ужо пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай для падачы ў Віцебскі правінцыйны земскі суд у 1773 г. была складзена «генеалогія» роду, у якой бацькам самага далёкага продка Захарыяша быў названы якраз кашталян Ян Кязгайла, а да прозвішча быў дададзены прыдомак «Гяжгайла» («Кяжгайла»). Нагодай для такога атаясамлівання стала некарэктнае расчытанне дакумента ад 1565 г., дзе фігураваў Ян Кязгайла, але не як продак, а як выстаўца дакумента для Канстовічаў.

З цягам часу паказанні родзічаў пры доказе шляхецтва сталі дапаўняцца спасылкамі на дакументальныя крыніцы, якія сведчылі пра паходжанне роду. Больш за тое, для падмацавання шляхецтва маглі прыцягвацца аргументы выразна «кніжнага» характару. У 1609 г. перад лідскім соймікам вывад шляхецтва вымушаны былі ажыццяўляць Кандыбы – род, які пераважна пражываў на Лідчыне, але да пачатку XVII ст. яго асобныя прадстаўнікі трапілі ў Гродзенскі і Віленскі паветы, а таксама на Валынь. Кандыбы сцвярджалі, што іх продак Барыс Прокшыч валодаў маёнткам у Смаленскай зямлі, на які атрымаў пацвярджальны прывілей караля польскага і вялікага князя літоўскага Казіміра (1440–1492). Апошняе вынікала з дакумента, выдадзенага ў 1605 г. з канцылярыі ВКЛ. Гэтыя звесткі мелі пад сабой рэальную гістарычную аснову. Барыс Прокшыч (з імем і прозвішчам у форме «Бориска Прокъшинъ») згадваўся ў кнізе наданняў Казіміра ў комплексе звестак, якія адносяцца да смаленскага баярства. У вывадзе адзначалася, што пасля захопу ў 1514 г. Смаленска Маскоўскай дзяржавай сын Барыса Кандыба (ад якога род і атрымаў прозвішча) застаўся ў ВКЛ і перасяліўся ў Лідскі павет. Аповед пра наступныя пакаленні роду таксама падмацоўваўся згадкамі пра родавыя дакументы.

Калі асноўная частка радаводу сапраўды мела дакументальную аснову, то звесткі пра самага ранняга меркаванага продка роду – Прокшу – былі запазычаны з беларуска-літоўскага летапісання. У 1609 г. ён характарызаваўся як «падчашы Вялікага Княства Літоўскага» і «падчашы Ягайлаў», адзначалася, што ён меў брата, імя якога перадавалася як Більгель. Апрача таго, у вывадзе наўпрост сцвярджалася, што звесткі пра іх прыведзены паводле бліжэй не акрэсленай «Хронікі». Усе гэтыя паведамленні маглі адносіцца толькі да аднаго чалавека. Імя Прокша насіў згаданы ў «Летапісцы вялікіх князёў літоўскіх» каморнік вялікага князя літоўскага Ягайлы, удзельнік забойства князя Кейстута. Натуральна, што інфармацыя пра ўдзел меркаванага продка ў забойстве князя ў вывадзе не перадавалася. Найбольш верагодна,

што звесткі пра Прокшу складальнік вывада атрымаў не непасрэдна з аднаго са спісаў беларуска-літоўскіх летапісаў, а праз папулярную «Хроніку» Мацея Стрыйкоўскага (1582 г.), дзе гэты сюжэт таксама прысутнічаў. Больш за тое, менавіта ў М. Стрыйкоўскага Прокша названы «падчашым», а Більгель (Більген) акрэслены як яго брат. У вывадзе не было пададзена ніякіх пераканаўчых доказаў ні таго, што забойца Кейстута быў тоесным бацьку смаленскага баярына Барыса Прокшыча (гэта малаверагодна), ні таго, што Барыс быў бацькам Кандыбы – пачынальніка аднайменнага шляхецкага роду з Лідскага павета (гэта магло адпавядаць рэчаіснасці). Тым не менш зварот да гістарычнай літаратуры сведчыць пра дастаткова развітую генеалагічную свядомасць Кандыбаў. Магчыма, у складанні вывада паўдзельнічаў адзін з тых, хто ў якасці родзіча пацвярджаў высакароднае паходжанне абвінавачаных у нешляхецтве. Маецца на ўвазе згаданы ў вывадзе як сведка пісар гродскі (у будучым гараднічы) уладзімірскі Станіслаў Кандыба (†1616). Ён быў вядомым адвакатам, на працягу многіх гадоў з'яўляўся службоўцам князёў Астрожскіх і Карэцкіх. Несумненна, што ён мог быць знаёмы як з творам М. Стрыйкоўскага, так і з самімі летапісамі ВКЛ, да якіх і ўзыходзіў сюжэт пра падчашага Прокшу. Зрэшты, чытачамі М. Стрыйкоўскага маглі быць і іншыя Кандыбы. У любым выпадку неабходнасць ажыццяўлення вывада Кандыбамі спрыяла фарміраванню іх родавай легенды.

Змяненні ў працэдуру доказу шляхецтва былі ўнесены соймавай канстытуцыяй 1633 г. Калі да яе выдання падача пісьмовых сведчанняў аб прыналежнасці да шляхецкага стану не была абавязковай, то з гэтага часу ў вывадзе павінны былі прысутнічаць згадкі пра дакументы, якія пацвярджалі высакароднае паходжанне. Дадзенае новаўвядзенне ілюструецца вывадамі слуцкага зямянскага роду Бранавіцкіх (Браневічаў). Яны двойчы вымушаны былі даказваць шляхецтва – у 1562 і 1668 гг. Калі ў першым выпадку Бранавіцкія апелявалі толькі да сведчанняў двух родзічаў, якія сцвярджалі, што продак роду прыбыў у ВКЛ з Карачава, то ў 1668 г. яны не толькі прадставілі некалькі сваякоў, якія пацвердзілі іх прыналежнасць да шляхты, але і падалі дакументальны доказ свайго шляхецтва, якім аказаўся якраз папярэдні вывад ад 1562 г.

Разнастайны набор дакументаў меў на руках шляхціц Лідскага павета і Віцебскага ваяводства Казімір Гурыновіч-Аравінка, якога ў 1642–1643 гг. абвінавачвалі ў нешляхецтве Павел і Даніэль Навіцкія. Пададзеныя К. Гурыновічам звесткі, што пачынаюцца ад яго прапрадзеда Місура і прадзеда Гурына (ён разам з братам Ярмолам служыў графу Юрыю Іллінічу), не выклікаюць падазрэнняў. Інакш выглядае справа ў выпадку Юрыя Мікалаевіча Аравінкі, які ў вывадзе ад 1643 г. быў названы пачынальнікам роду. Пра яго сцвярджалася, што ён атрымаў ад вялікага князя літоўскага Аляксандра наданне на рацэ

Жыжма ў Лідскім павеце, што было пацверджана ў 1510 г. наступным уладаром ВКЛ Жыгімонтам І. Сумненні ў дачыненні Юрыя Мікалаевіча Аравінкі да продкаў Гурыновічаў вынікаюць з таго, што названы ў вываdзе ад 1643 г. яго сынам Місур у гістарыяграфіі лічыцца татарынам. У такім выпадку яго бацька не мог насіць такое выразна хрысціянскае імя. Як і ў прыведзеных вышэй прыкладах, Гурыновічы маглі некалькі «ўдасканаліць» свой радавод, згадаўшы ў ім атрымальніка прывілеяў Аляксандра і Жыгімонта І. З іншага боку, меркаванне пра Місура Аравінку як татарына грунтуецца амаль выключна на яго татарскім імені. Аднак у першай палове XVI ст. у Маскоўскай дзяржаве жыў Міхаіл Грыгор’евіч Мунехін, які меў падобную мянушку Місюр. Міхаіл Мунехін, несумненна, быў хрысціянінам, хаця наяўнасць у яго татарскіх каранёў цалкам выключаць нельга. Так ці інакш, у выпадку бацькі Гурына і Ярмолы Місур магло быць не імем, а мянушкай, якая неабавязкова сведчыла пра яго татарскі радавод.

Наогул, апеляцыя да старадаўніх дакументаў ці нават да яшчэ больш старажытных рэалій, адлюстраваных у гэтых дакументах, не была чымсьці незвычайным. Падчас вывада шляхецтва, які ажыццяўляўся Яўневічамі на сойміку Мсціслаўскага ваяводства ў 1727 г., яны выводзілі сябе з баярства-шляхты Абольцаўскай воласці, падавалі дакументы караля польскага і вялікага князя літоўскага Аляксандра, а таксама Боны Сфорца, з якіх вынікала, што продак роду служыў князям Сямёну і Васілю Іванавічам Шамячычам, якія трымалі Абольцы ў апошняй чвэрці XV ст.

Не заўсёды ў справы аб «нагане шляхецтва» трапляла толькі дробная шляхта. У 1636 г. дэкрэтам сойміка Мінскага ваяводства было пацверджана шляхецтва Войцеха, Аляксандра і Крыштафа Замайскіх. У прысвойванні шляхецкай годнасці іх абвінавацiў падстолі старадубскі Пётр Клячкоўскі. Традыцыйна спрэчка аб гонары грунтавалася на маёмасных непаразуменнях – Клячкоўскі прэтэндаваў на маёнткі Замайскіх у ВКЛ. У той жа час бацька згаданых вышэй Замайскіх Базыль быў значным ураднікам у Мінскім ваяводстве, займаў пасаду гродскага суддзі, у маладосці знаходзіўся ў атачэнні папскага легата знакамітага Антонія Пасевіна. У выводзе Замайскіх верагодныя звесткі сумяшчаліся з выразна легендарнымі. Дзедам Базыля выстаўляўся вядомы палітычны дзеяч сярэдзіны XV ст. Грыцка Кірдзеевіч, сын якога Зыгмунт называўся бацькам Базыля. Апошняе дакладна не адпавядала рэчаіснасці. Зыгмунт Грыцкавіч загінуў у 1499 г. і ніяк не быў звязаны з Навагрудскім і Мінскім ваяводствамі (дзе знаходзіліся асноўныя маёнткі Замайскіх). У той жа час бацька Базыля быў сярод жывых яшчэ ў 1521 г. Працэс аб «нагане шляхецтва» таксама пасадзейнічаў фарміраванню легенды аб паходжанні роду ад падольскіх Кірдзеевічаў, менавіта такі прыдомак род ужываў яшчэ ў XIX ст.

Аднак выпадкі, калі пад сумненне ставілася высакароднае паходжанне прадстаўнікоў заможных родаў, былі нешматлікімі. Істотна часцей вымушана была рабіць вывады дробная шляхта. Асабліва востра праблема пацвярджэння прыналежнасці да вышэйшага стану стаяла перад зямянамі – залежнай шляхтай, якая служыла буйным панам (перш за ўсё, несла ваенную службу ў іх харугвах) і атрымлівала за гэта ў карыстанне зямлю.

У шэрагі зямян, акрамя выхадцаў з паўнапраўнай павятовай шляхты, у XVII–XVIII стст. траплялі былыя прадстаўнікі мяшчанскага і сялянскага саслоўяў. Сярод апошніх да зямянскага статусу найчасцей павышаліся баяры – спецыфічная катэгорыя сялян-слуг, якія, як правіла, займаліся дастаўкай грузаў і карэспандэнцыі (так званыя «путныя і лістоўныя баяры»), а таксама маглі, як і зямяне, выконваць ваенную павіннасць («панцырныя баяры»). У такім выпадку «нядаўнія» зямяне не маглі валодаць несумненнымі доказамі прыналежнасці да шляхецкага стану, што магло паслужыць дадатковым аргументам для абвінавачвання ў нешляхецтве падчас судовых працэсаў. У 1670 г. зямян Міхалоўскіх, якія пражывалі ў засценку Лаўравічы (Старчыцкі двор Слуцкага княства), абвінавацілі ў прысвойванні шляхецкай годнасці суседзі па засценку Пантусевічы. Яшчэ да войнаў сярэдзіны XVII ст. Міхалоўскія (у гэты час яны часцей ужывалі патранімічныя формы прозвішчаў – Міхайловічы і Міхалкевічы) былі баярамі ў маёнтку Старыца Капыльскага княства і выразна адасабляліся ад мясцовых зямян (напрыклад, у інвентары ад 1646 г.). Пасля войнаў яны замацаваліся ў зямянскім асяроддзі. У 1668 г. Фёдар Міхалкевіч (Міхайловіч) падаў супліку на імя тагачаснага ўладальніка Старыцы князя Багуслава Радзівіла наконт таго, што іх няслушна не прызнаюць зямянамі. Насуперак звесткам інвентара 1646 г. радзівілаўскія камісары Георг-Ёган Бярновіч і Самуэль-Уладзіслаў Вішнеўскі прыраўнялі іх да іншых зямян. Той самы Самуэль Вішнеўскі канчаткова замацаваў зямянскі статус Міхалоўскіх у 1671 г., калі выдаў пасведчанне аб тым, што *«на працягу васьмідзесяці гадоў як іх продкі, так і яны самі застаюцца і ўсе павіннасці нароўні з зямянамі сяла Кандратавічы выконваюць»*. Паказальна, што прыкладна ў гэты час яны сталі ўжываць больш «шляхецкі» варыянт свайго прозвішча – Міхалоўскія. Аднак, верагодна, баярскі радавод Міхалоўскіх не з'яўляўся сакрэтам для іншых зямян – не толькі старыцкіх, але і тых, якія пражывалі побач з Міхалоўскімі ў іншых маёнтках Слуцкага і Капыльскага княстваў.

Матэрыялы судовых працэсаў аб «нагане шляхецтва» адлюстроўваюць таксама больш складаныя трансфармацыі ў межах сацыяльных груп баяр і зямян. У 1678 г. адбыўся канфлікт паміж жыхарамі зямянскай вёскі Балотчыцы (Іванскі двор Слуцкага княства) Лабейкамі і Корбутамі. Сярод іншага, Корбутам было выстаўлена абвінавачанне ў нешляхецтве. У адказ на гэта

яны падалі наступныя дакументы: ліст князя Юрыя II Юр’евіча Алелькавіча ад 25 кастрычніка 1548 г. (індыкт 6) да намесніка баславіцкага, каб ён не чыніў крыўдаў і не накіроўваў «у дарогу» Корбутаў (Карбутовічаў), бо яны шляхта, і дэкрэт удавы Юрыя II Кацярыны Тэнчынскай ад 1 снежня 1578 г., якім Корбутам прысуджана зямля ў маёнтку Грозава на рацэ Вужа. Першы з гэтых дакументаў сведчыць пра тое, што ўжо ў сярэдзіне XVI ст. статус Корбутаў не быў дакладна вызначаным. Яны мелі шляхецкае паходжанне, але мясцовая адміністрацыя Слуцкага княства (насуперак нават княжацкай волі) успрымала іх як лістоўных баяр. Плыннасць становішча Корбутаў пацвярджаецца і дакументамі, не звязанымі з ажыццёўленым у 1678 г. вывадам. У інвентары ад 1565 г. яны ў вялікай колькасці прадстаўлены сярод баяр сяла Вужа Грозаўскага двара (пра трыманне Корбутамі зямлі ў Грозаўскім маёнтку сведчыць і згаданы вышэй дэкрэт княгіні Кацярыны ад 1578 г.). Аднак паходзілі яны са слонімскай шляхты. У 1532 г. Пётр Корбут атрымаў прывілей Жыгімонта I на пустаўшчыну Брыкаўскую з адным падданым, у 1538 г. той жа Пётр паступіў на службу да князя Юрыя I Сямёнавіча Алелькавіча і атрымаў зямлю на рацэ Вужа (будучы аднайменны засценак). Корбуты не пазначаны ў ранніх спісах слуцкіх зямян, складзеных у 1566 і 1600 гг. Тым не менш іх шляхецкае паходжанне з’яўлялася добра падмацаваным, што і было адлюстравана ў вывадзе ад 1678 г.

Звесткі вывада Корбутаў дастаткова верагодныя, але не варта безумоўна давяраць інфармацыі, занатаванай у зямянскіх вывадах XVI–XVIII стст. У 1669 г. яшчэ адны выхадцы з баярскага сяла Вужа Жоўрыды (Жаўрыды) вялі працэс супраць Казіміра Багінскага, які абвінаваціў іх у незаконным прыўлашчванні шляхецкай годнасці. Вытокі гэтай справы таксама насілі побытавы характар – К. Багінскі збіў зямяніна вёскі Шулякі Мікалая Жоўрыда і не хацеў выплочваць за гэта кампенсацыю як за збіццё шляхціца. Нягледзячы на тое, што сам Мікалай Жоўрыд ужо не пражываў у Вужы, у якасці самага ранняга родавага дакумента ён падаў выпіс з Навагрудскага земскага суда ад 16 лютага 1604 г. аб актыкацыі ліста князя Юрыя I Сямёнавіча Алелькавіча ад 4 красавіка 1530 г. віцебскаму баярыну Паўлу Жоўрыду *«на засценак пры рацэ Вужы»*. Гэты дакумент захаваўся ў Жоўрыдаў да пачатку XIX ст. і быў пададзены імі ў Мінскі ДДС для доказу дваранства падчас «разбору шляхты». Аднак яго змест выклікае пэўныя сумненні. Перш за ўсё, называнне зямельнага надзелу «засценкам» было неўласціва для дакументаў да часоў «валочнай памеры». Апрача таго, 1530 г. – гэта 3-і, а не 12-ы (як пазначана ў выпісе) індыкт. У якасці яшчэ аднаго доказу прыналежнасці да шляхецкага стану выстаўляўся маніфест аб знішчэнні родавых папер падчас маскоўскага нападу, які быў унесены жыхаром засценка Вужа Васілём Жоўрыдам у Навагрудскі гродскі суд 27 жніўня 1660 г. У маніфесце сцвярджалася, што

В. Жоўрыд страціў розныя дакументы, *«а менавіта ліст светлай памяці князя яго міласці Алелькавіча на землі, прадзеду яго за выслугу дадзеныя, які ліст і ў кнігах навагрудскіх быў актыкаваны, пры тым нямала розных спраў на шляхецкія зямельныя маёнткі, як прадажныя лісты, так і купчыя на шляхецкія землі ў Віцебскім павеце, падзелы паміж братамі і інвентары, інтрамісіі, попісавыя квіты аб выкананні паспалітага рушання, квіты выплаты падаткаў у скарб Яго каралеўскай міласці з маёнтка іх [Жоўрыдаў] вотчыннага Прусінава»*.

З улікам таго, што Жоўрыды ўжо ў сярэдзіне XVI ст. былі баярамі ў Вужы, звесткі маніфеста выклікаюць сумненні. Вельмі малаверагодна, што яны, нават калі сапраўды паходзілі з Віцебскага ваяводства, захавалі попісавыя і падатковыя квіты за першую палову XVI ст. Факт існавання прывілея князя Юрыя Алелькавіча ад 1530 г. цалкам адмаўляць нельга, але, верагодна, ён быў інтэрпаляваны ў XVII ст. (дададзена згадка пра віцебскае паходжанне Жоўрыдаў). Праўка тэксту магла спатрэбіцца якраз падчас працэсаў аб «нагане шляхецтва». У сярэдзіне XVII ст. Жоўрыды неаднаразова траплялі ў іх. У самім дэкрэце па справе супраць К. Багінскага занатавана, што сваё паходжанне даказвалі бацька і брат Мікалая [30, арк. 48]. Магчыма, бацькам Мікалая быў Пратас, які ў 1636 г. атрымаў атэстацыйны ліст *«шляхты, жыхароў Слуцкага княства і Навагрудскага ваяводства»* аб шляхецкім паходжанні з прычыны процілеглага сцвярджэння з боку Рыгора Трасейкі-Лазоўскага. Відавочна, што тады таксама адбываўся вывад шляхецтва Жоўрыдамі, матэрыялы якога не захаваліся.

У 1668 г. Слуцкі замкавы суд разглядаў справу, ініцыяваную зямянінам Янам Казарыным. Ён абвінаваціў у нешляхецтве зямян Чарнышэвічаў з вёскі Касынічы (Старчыцкі двор Слуцкага княства). Кантэкст справы таксама быў побытава-крымінальным, Ян Казарын збіў сыноў Івана Чарнышэвіча Рамана і Лаўрына і не хацеў за гэта плаціць грашовую кампенсацыю. У адказ на абвінавачанне Чарнышэвічы падалі прывілей князя Юрыя II Алелькавіча продку роду Івану Чарнышу, выдадзены ў 1576 г. Паводле яго, Чарнышэвічам надаваліся пяць валок ва ўрочышчы Касынічы з умовай нясення земскай ваеннай службы. Выклікаюць сумненні акалічнасці, выкладзеныя ў наданні. Жыхары Касынічаў былі пераведзены з баярскай путнай на зямянскую ваенную павіннасць толькі ў 1626 г., у той жа час сцвярджалася, што продак Чарнышэвічаў атрымаў зямлю на ўмовах ажыццяўлення ваеннай службы ўжо ў 1576 г. Магчыма, згадка пра ваенны (шляхецкі) характар павіннасцей Чарнышэвічаў была дададзена ў дакумент пазней.

Калі разгледжаныя вышэй зямянскія роды пры вывадзе шляхецтва ў Слуцкім замкавым судзе абапіраліся на наяўныя ў іх родавыя дакументы (рознай ступені верагоднасці), то Мастовічы, якія пераважна пражывалі ў за-

сценку Дошнава Вызненскага двара, выкарысталі іншы спосаб доказу. Абвінавачаныя ў 1685 г. у нешляхецтве Ежы Крукоўскім, яны звярнуліся да Мастовічаў з Жамойцкага княства, якія выдалі слуцкім зямянам два пасведчанні (у 1685 і 1686 г.) аб супольным шляхецкім паходжанні. У пасведчаннях, сярод іншага, выкладаўся радавод слуцкай галіны Мастовічаў, выстаўлялася, што яны паходзілі з Медынгянскай валасці («поля») у Жамойці. Сярод жамойцкіх шляхецкіх родаў сапраўды фігуравалі Мастовічы. Аднак немагчыма ні ўпэўнена пацвердзіць, ні абгрунтавана абвергнуць агульны радавод медынгянскіх і слуцкіх Мастовічаў.

У рэдкіх выпадках пацвярджэнне шляхецтва нават у другой палове XVII ст. магло адбывацца на падставе вусных сведчанняў. Зямянскі харужы вёскі Сорагі (Урэцкі двор Слуцкага княства) Марцін Масакоўскі ў 1679 г. быў абвінавачаны ў нешляхецтве зямянамі Мохартамі. Тады ён падаў на імя генеральнага аканома Слуцкага княства Казіміра-Крыштафа Клакоцкага супліку, дзе выклаў сваё паходжанне. Марцін сцвярджаў, што яго бацька паходзіў з Плоцкага ваяводства, служыў пад кіраўніцтвам гетмана Хадкевіча, каля 60 гадоў таму прыбыў у Сорагі, дзе ажаніўся. Адзіным знешнім аргументам, які павінен быў пацвердзіць словы М. Масакоўскага, былі сведчанні яго аднавяскоўцаў Шубаў. Выкладзеная Марцінам гісторыя роду не ўтрымлівае відавочных супярэчнасцей. Разгалінаваны шляхецкі род Масакоўскіх сапраўды жыў у гістарычнай Мазовіі (гняздо іх, аднак, знаходзілася не ў Плоцкай, а ў размешчанай непадалёк ад яе Цяханаўскай зямлі), згаданы ў супліцы гетман Хадкевіч – гэта Ян-Караль Хадкевіч (†1621), які ў пачатку XVII ст. узначальваў войска ВКЛ у працяглай вайне супраць Швецыі. Апеляцыя да сведчанняў Шубаў магла быць абумоўлена роднаснымі сувязямі – магчыма, маці Марціна якраз паходзіла з гэтага роду. Так ці інакш, нават такія непадмацаваныя дакументамі доказы былі прыняты К.-К. Клакоцкім, які пацвердзіў шляхецтва Масакоўскіх.

Вывады ажыццяўляліся асобнымі родамі толькі ў выпадку выстаўлення супраць іх абвінавачання ў нешляхецтве, але зямяне вымушаны былі таксама сістэматычна падаваць дакументы, якія пацвярджалі б іх статус, на рэвізію адміністрацыі маёнткаў, дзе яны пражывалі. У дастаткова вялікім аб'ёме матэрыялы зямянскіх рэвізій наяўныя для Слуцкага і Капыльскага княстваў князёў Радзівілаў. Захаваліся дзве вялікія кнігі, складзеныя па выніках праверак прыналежнасці да зямянскай супольнасці ў 1670–1680-я і ў 1730-я гг. Апрача таго, асобныя комплексы зямянскіх рэвізій, праведзеных у сярэдзіне 1680-х гг., выяўлены для маёнтка Пагост Слуцкага княства і маёнтка Старыца Капыльскага княства. Пры гэтым далёка не ўсім звесткам пра паходжанне, якія выкладаліся зямянамі падчас рэвізій, варта давяраць.

Падчас рэвізіі 1687 г. у дачыненні да зямяніна з засценка Шылаўшчына (Старыцкі двор Капыльскага княства) Ежы Адамовіча адзначалася, што ён,

*«як сцвярджаюць, [паходзіць] з Мінскага ваяводства»*. Вонкава гэта выглядае дастаткова верагодным. Шляхецкі род Адамовічаў пражываў у Мінскім ваяводстве. Сусед Ежы Адамовіча былы вайсковец Марцін Гедзвіл, сапраўды, паходзіў з Жамойці (як гэта сцвярджалася пры рэвізіі), дзе такое прозвішча было дастаткова распаўсюджаным. Аднак у выпадку Ежы Адамовіча сумненні ў яго нетутэйшым паходжанні ўзнікаюць на падставе некалькіх акалічнасцей. У інвентарах 1680-х гг. ён фігураваў на даволі вялікім надзеле (у адну з чвэрцю валоку), але не адзін, а з не названымі пайменна «сябрамі», што магло сведчыць пра тое, што ён меў родзічаў у Старыцы, з якімі супольна трымаў зямянскі надзел. Больш за тое, прозвішча Адамовіч масава сустракалася сярод жыхароў чыншавай вёскі Пырашава (Пырашаўская Слабада). Магчыма, менавіта адтуль і паходзіў Ежы. У такім выпадку яго сялянскі радавод мог быць прыхаваны апеляцыяй ад паходжання з Мінскай шляхты.

Аднак сапраўдная хваля звароту зямян Слуцкага і Капыльскага княстваў да сфальсіфікаваных дакументаў назіралася ў 1720–1730-я гг. У гэты час княствы адносіліся да так званых «нойбургскіх валоданняў», за якія ішла зацятая барацьба паміж некалькімі родамі (перш за ўсё нясвіжскай галіной Радзівілаў і Сапегамі). У 1733 г., пасля смерці караля польскага і вялікага князя літоўскага Аўгуста II (які з 1710 г. з’яўляўся застаўным трымальнікам «нойбургскіх валоданняў»), у суды Навагрудскага ваяводства пачалі масава ўносіцца прывілеі, якія пацвярджалі шляхецкае паходжанне мясцовых зямян, а таксама іх правы на зямельныя трыманні. Найбольш верагодна, што зямяне спрабавалі тым самым замацаваць свой статус перад непазбежным знаёмствам з новымі панамі. Магчыма, яны таксама меркавалі, што неўзабаве адбудзецца праверка іх правоў на зямянскі статус і зямлю, тым больш, што падобнае мерапрыемства ў суседняй Нясвіжскай ардынацыі было адносна нядаўна (у 1722 г.) праведзена яе ўладальніцай княгіняй Ганнай-Кацярынай Радзівіл.

Сярод пададзеных у 1733 г. дакументаў былі, несумненна, сапраўдныя. Напрыклад, да іх адносіўся прывілей князёў Яна-Сімяона і Аляксандра Алелькавічаў ад 25 студзеня 1587 г. гараднічаму і варотнаму слуцкаму Лявону Чайку на 5 валок у засценку Чайчыцкі. Яго нашчадкі Чайкоўскія неаднаразова ў XVII ст. прад’яўлялі гэты дакумент радзівілаўскім камісарам – у 1626, 1646 і 1659 гг. Аднак значная частка з актыкаваных у 1733 г. зямянскіх прывілеяў з’яўлялася фальсіфікатамі. У найбольшай ступені несапраўдныя акты патрабаваліся нашчадкам былых баяр, якія не мелі дакументаў, якія пацвярджалі б іх шляхецтва. 25 красавіка 1733 г. зямянін Ян Мардзвіновіч актыкоўваў ліст, нібыта выдадзены яго продкам Фаме і Івану з «зямлі Мінскай» па справе супраць Аляксандра і Базыля Тоўкачаў аб маёнтку каля вёскі Ліцвяны. Дакумент быў датаваны 1550 г., але выстаўлены ад імя Жыгімонта III Вазы, які,

канешне, не панаваў у ВКЛ у гэты час. Мардзіновічы (Мардзвінаўцы) яшчэ па стане на 1645–1646 гг. лічыліся баярамі ў маёнтку Яромічы, пасля войнаў сярэдзіны XVII ст. яны перайшлі на зямянскую службу, але ніякіх старажытных дакументаў не мелі.

Казлоўскія ў 1733 г. падавалі пленіпатэнцыйны ліст, нібыта выдадзены ў 1608 г. князем Янушам Радзівілам і яго жонкай княгіняй Зоф'яй Алелькавіч службоўцу Паўлу Казлоўскаму. У дакуменце адзначалася, што яго род паходзіў з Кіеўскага ваяводства, на службе ў Алелькавічаў знаходзіўся яшчэ бацька Паўла Юрый, а Павел за свае і бацькавы заслугі атрымаў пяць валок у засценку Радкава (Пруські двор Слуцкага княства). У сярэдзіне XVII ст. Казлоўскія сапраўды жылі ў Радкаве, але затым пераважна аселі ў засценку Іздрашава (Старчыцкі двор). Аднак найбольш верагодна, што Казлоўскія паходзілі з неаднаразова згаданай раней вёскі Вужа, у інвентары якой у 1565 г. пазначаны баярын Пархім Казловіч. Адсутнасць сапраўдных шляхецкіх дакументаў прымушала Казлоўскіх спасылацца на сфальсіфікаваны дакумент ад 1608 г.

Неабходна адзначыць, што актыкацыю фальшывых дакументаў на шляхецтва выкарыстоўвалі не толькі роды, якія перайшлі з баярскай на зямянскую павіннасць ужо ў XVII ст., але і тыя, хто знаходзіўся на зямянскай службе яшчэ ў часы князёў Алелькавічаў. У 1733 г. Шулякоўскія сцвярджалі, што іх продак у 1566 г. атрымаў прывілей Жыгімонта II Аўгуста з пацвярджэннем шляхецкай годнасці і паходжання з вёскі Шуляковічы Падольскай зямлі. Аднак гэты дакумент не меў ніякага дачынення да сапраўдных каранёў роду. Шулякоўскія, якія ў сярэдзіне XVI ст. яшчэ зваліся Шулякамі, згадваліся сярод слуцкіх зямян у тым жа 1566 г.

Такім чынам, у адрозненне ад ініцыяваных уладамі Расійскай імперыі вывадаў шляхецтва канца XVIII – XIX ст., справы аб «нагане шляхецтва» часоў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай пачыналіся, як правіла, у выніку міжасабовых канфліктаў і не насілі масавага характару. Тым не менш, як і ў XIX ст., у больш ранніх вывадах шляхецтва не ўсе звесткі адпавядалі рэчаіснасці, асабліва гэта тычылася інфармацыі пра найбольш аддаленых продкаў. Дробная шляхта часцей трапляла ў справы аб вывадзе шляхецтва. Асабліва праблема доказу ўласнага паходжання была актуальнай для зямян (залежнага ад магнатаў ваенна-служылага насельніцтва), частка якіх мела сялянскія і мяшчанскія карані. Апрача таго, зямяне павінны былі прад'яўляць дакументы аб сваім паходжанні на зацвярджэнне адміністрацыі маёнткаў, дзе яны пражывалі. Ажыццяўленне вывадаў шляхецтва, сярод іншага, садзейнічала фарміраванню генеалагічных легенд, якія затым маглі выкарыстоўвацца для павышэння сацыяльнага прэстыжу асобных родаў.

* * *

У 2019–2021 гг. у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі працягвалася распрацоўка планавай навуковай тэмы «Генеалогія і геральдыка шляхецкіх родаў Беларусі», адным з вынікаў ажыццяўлення якой стала падрыхтоўка дадзенай часткі тома «Гербоўніка». Яна ахоплівае радаводы шляхты пераважна Мінскай губерні, чые прозвішчы пачынаюцца на літару «К» (да прозвішча «Карэцкія» ўключна), і змяшчае 224 артыкулы. Як і ў папярэдніх тамах, у гэтую частку ўключаны і тыя роды, што маюць падвойнае прозвішча, асноўная частка якога пачынаецца на літару «К»:

«Шавердыковічы-Кавалеўскія», «Верушы-Кавальскія», «Пушкіны-Кажаноўскія», «Курачыцкія-Казакевічы», «Смолькі-Казакевічы», «Акулічы-Казарыны», «Бібэрштэйны-Казімірскія», «Ролічы-Казлоўскія», «Доевы-Казлоўскія» («Дояды-Казлоўскія»), «Гушчы-Казлоўскія», «Гескія-Каладзінскія» («Гескім-Каладзінскія»), «Сялецкія-Калбы», «Стадніцкія-Календы», «Дзмітровічы-Калясінскія», «Цёлкі-Камароўскія», «Ролічы-Каменскія», «Ляневічы-Каменскія», «Багрыны-Камінскія», «Радзівановічы-Камінскія», «Бурчымухі-Камінскія», «Корвіны-Камінскія», «Прокшыцы-Кандыбы», «Пагожыя-Канстанціновічы», «Гяжгайлы-Канстовічы» («Кяжгайлы-Канстовічы»), «Любрыцкія-Капулцэвічы», «Пенькі-Капцевічы», «Караневічы-Высоцкія», «Мажэйкі-Каранеўскія», «Карзюкі-Залескія», «Бабpоўскія-Каролькі», «Чарвонкі-Карыбскія», «Бондзы-Карыцкія».

Як і раней, у гэтую частку тома не ўключаліся тыя роды, у якіх на літару «К» пачынаецца толькі прыдомак – «Ваўкі-Карачэўскія», «Каладзінскія-Адуцкевічы», «Карыбуты-Дашкевічы».

Артыкулы, уключаныя ў гэты том, напісаны паводле той жа схемы, што была выкарыстана ў папярэдніх тамах, і складаюцца з 5 частак:

1) прозвішча роду, магчымы прыдомак, герб;

2) весткі пра легенды аб паходжанні роду або найбольш старажытных вядомых прадстаўнікоў;

3) пакаленны роспіс, створаны на падставе матэрыялаў, пададзеных у Мінскі ДДС;

4) звесткі пра зацвярджэнне ці незацвярджэнне роду ў расійскім дваранстве ўказамі Сената;

5) крыніцы, на падставе якіх напісаны артыкул.

Апрача таго, вялікая ўвага надаецца ўключэнню ў артыкулы звестак пра тых асоб, чые дакументы маюцца ў справах аб дваранскім паходжанні таго ці іншага роду, аднак іх сваяцкія сувязі з ім не ўдаецца вызначыць. Артыкулы змяшчаюць даволі падрабязныя каментарыі, куды выносяцца звесткі пра сумнеўныя і сфальсіфікаваныя дакументы (на што звяртаецца асаблівая ўвага), аўтарскія заўвагі і тлумачэнні наконт асаблівасцей канкрэтных радаводаў.

* * *

Падставай для напісання восьмага тома па-ранейшаму з'яўляюцца справы фонду Мінскага ДДС (ф. 319, вопісы 1 і 2). Звесткі, змешчаныя ў іх, пры неабходнасці маглі дапаўняцца іншымі матэрыяламі (архіўнымі і апублікаванымі дакументамі, навуковай літаратурай), калі яны меліся ў таго ці іншага аўтара падчас напісання артыкула. Аднак пошук гэтых дадатковых матэрыялаў у якасці асобнай задачы не ставіцца. Не варта забывацца, што справы аб дваранскім паходжанні не з'яўляюцца адзінымі крыніцамі па гісторыі шляхецкіх родаў Беларусі. Кола гэтых крыніц вельмі вялікае, таму абсалютызацыя прынцыпу ўсеагульнасці крыніц для напісання таго ці іншага артыкула вяла б да бясконцага расцягвання выхаду нават аднаго тома «Гербоўніка» і зрабіла б яго выданне немагчымым.

Першая частка восьмага тома, як і папярэднія тамы, забяспечана паказальнікамі імёнаў і геаграфічных назваў. Да яе дадаюцца таксама каляровыя выявы часткі гербаў шляхецкіх родаў, якія маюцца ў матэрыялах фонду (у справах аб паходжанні асобных родаў і кнігах вывадовых пратаколаў), і асобныя генеалагічныя табліцы. Змясціць усе наяўныя гербы і генеалагічныя табліцы, на жаль, немагчыма з прычыны абмежаванага аб'ёму тома і вялікіх памераў некаторых з іх. Паколькі дзякуючы сучасным інфармацыйным тэхналогіям выявы гербаў сталі лёгкадаступнымі для даследчыкаў, у гэтую частку тома ўключаны толькі тыя выявы, якія змешчаны ў дакументах самімі прадстаўнікамі роду, нават калі малюнкі выкананы на дастаткова прымітыўным узроўні.

У гэтай частцы тома, як і ў папярэдніх тамах, пазначэнне адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прыналежнасці населеных пунктаў здзейснена наступным чынам. У выпадку, калі звесткі тычацца перыяду Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, пазначаецца толькі павет або ваяводства (напрыклад, Мазырскі пав., Полацкае ваяв. і да т. п.). Калі ж звесткі адносяцца да перыяду Расійскай імперыі, указваюцца як павет, так і губерня (напрыклад, Рэчыцкі пав. Мінскай губ., Кобрынскі пав. Гродзенскай губ. і да т. п.).

Аўтарскі калектыў выказвае шчырую падзяку ўсім, хто дапамагаў пры складанні гэтай кнігі: дырэктару Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі Дзмітрыю Уладзіміравічу Яцэвічу за арганізацыйную дапамогу ў выданні, а таксама ўсім супрацоўнікам архіва, якія мелі дачыненне да падрыхтоўкі першай часткі тома.

**Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі** працягвае працу па складанні чарговых тамоў «Гербоўніка». Другая частка восьмага тома будзе ўключаць каля 200 пакаленных роспісаў наступных шляхецкіх родаў пераважна з Мінскай губерні, прозвішча якіх пачынаецца на літару «К».

[1] Радаводы астатніх родаў на літару К будуць надрукаваны ў наступных (другой і трэцяй) частках восьмага тома «Гербоўніка».

[2] У прадмовы да папярэдніх тамоў «Гербоўніка», як правіла, уключаліся агляды найноўшых напрацовак беларускай гістарыяграфіі па тэмах, звязаных з мінулым шляхецкага саслоўя. Аднак папярэднія тамы серыі выйшлі адносна нядаўна – у 2020 г. З таго часу з'явілася не так шмат даследаванняў, прысвечаных гісторыі шляхты, што не дазваляе прасачыць і адлюстраваць тэндэнцыі ў развіцці гістарыяграфіі праблемы. Таму было вырашана падрыхтаваць агляд айчыннай гістарыяграфіі за больш значны прамежак часу і надрукаваць яго ў адным з наступных тамоў «Гербоўніка».

[3] Статут Великого княжества Литовского 1529 года / Под ред. К. И. Яблонскиса. – Минск: Изд-во Академии наук БССР, 1960. – С. 50. Норма была паўторана ў Статутах 1566 і 1588 гг. (Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года / Т. І. Доўнар, У. М. Сатолін, Я. А. Юхо. – Мінск: Тэсей, 2003. – С. 85; Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі. – Мінск: БелСЭ, 1989. – С. 121).

[4] Напрыклад: Lietuvos Metrika (1554–1568). 35-oji Teismų bylų knyga (XVI a. pabaigos kopija) / Parengė S. Viskantaitė-Saviščevienė, I. Valikonytė. – Vilnius: Vilniaus universiteto leidykla, 2018. – P. 132–133. Вывады шляхецтва часоў Рэчы Паспалітай прыцягваюць увагу даследчыкаў (*Вінниченко, О.* Доведення шляхетства на сеймиках Руського воєводства у Вишні (XVII – середина XVIII ст.): правова регламентація і повсякденна практика // Повсякдення ранньомодерної України. Історичні студії. – В 2 т. – Т. 1: Практики, казуси та девіації повсякдення. – Київ: Інститут історії України НАН України, 2012. – С. 13–40; *Вінниченко, О.* Доведення шляхетства на сеймиках Руського воєводства в XVII – першій половині XVIII ст.: генеалогічні аспекти // Генеалогія. Збірка наукових праць. – Вип. 2. – Київ: ВД «Антиквар», 2016. – С. 103–129; *Мяцельскі, А.* Наганы і вывады шляхецтва ў Вялікім Княстве Літоўскім. Два дакументы 1579 года з судовай кнігі № 272 Метрыкі ВКЛ) // Герольд Litherland. – № 19. – 2013. – С. 110–117). Асобна трэба адзначыць серыю даведачных выданняў, прысвечаных шляхце беларускіх зямель у XVIII ст., складзеных Яўгенам Анішчанкам. У прадмовах да іх занатаваны і часам сцісла апісаны вывады шляхецтва, якія былі ўнесены ў кнігі земскіх і гродскіх судоў (найбольш багатыя на прыклады вывадаў шляхецтва наступныя кнігі Я. К. Анішчанкі: *Анищенко, Е. К.* Шляхта Брестского воеводства: Список XVIII ст. – Минск: Изд. В. Хурсик, 2011. – С. 8–11; *Его же.* Шляхта Лидского повета: Список XVIII ст. – Минск: Изд. В. Хурсик, 2013. – С. 5–8; *Его же.* Шляхта Минского воеводства: Список XVIII ст. – Минск: Изд. В. Хурсик, 2020. – С. 5–13; *Его же.* Шляхта Мстиславского воеводства: Список XVIII ст. – Минск: Изд. В. Хурсик, 2013. – С. 6–9; *Его же.* Шляхта Новогрудского воеводства: Список XVIII ст. – Минск: Изд. В. Хурсик, 2017. – С. 4–15; *Его же.* Шляхта Пинского повета: Список XVIII ст. – Минск: Изд. В. Хурсик, 2016. – С. 4–5; *Его же.* Шляхта Слонимского повета: Список XVIII ст. – Минск: Изд. В. Хурсик, 2012. – С. 5–10).

[5] *Пичета, В. И.* Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве. – Москва: Изд-во Академии наук СССР, 1958. – С. 300–310. Істотная колькасць

вывадаў, выкліканых правядзеннем аграрнай рэформы, надрукавана ў: Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией. – Т. 24: Акты о боярах. – Вильна: Типография А. Г. Сыркина, 1897.

[6] Верагодна, маецца на ўвазе Жыгімонт Кейстутавіч (1432–1440) ці Жыгімонт I Стары (1506–1548).

[7] На ўрадзе знаходзіўся ў 1477–1485 гг. (Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. – T. 1: Województwo wileńskie, XIV–XVIII wiek / Oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba, P. P. Romaniuk, przy współpr. U. Jemialianczyka, A. Macuka. – Warszawa: DiG, 2004. – S. 108).

[8] *Piekosiński, F.* Herbarz szlachty prowincyi witebskiej. – Kraków: Herold polski, 1899. – S. 43.

[9] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). Ф. 319, воп. 2, спр. 1397, арк. 14, 36 адв., 53. Прыдомак «Кязгайла» («Кяжгайла») настолькі трывала ўпісаўся ў родавую свядомасць Канстовічаў, што некаторыя з іх выкарыстоўвалі яго нават у XX ст. (*Błaszczyk, G.* Herbarz szlachty żmudzkiej. – T. 3. – Warszawa: DiG, 2015. – S. 66–67).

[10] Факт ажыццяўлення вывада згадваўся ў: *Анищенко, Е. К.* Шляхта Гродненского повета: Список XVIII ст. – Минск: Изд. В. Хурсик, 2018. – С. 5.

[11] НГАБ. Ф. 1755, воп. 1, спр. 63, арк. 1297 адв.–1298.

[12] Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 3 (1440–1498). Užrašymų knyga 3 / Parengė L. Anužytė ir A. Baliulis. – Vilnius: Žara, 1998. – P. 35.

[13] НГАБ. Ф. 1755, воп. 1, спр. 63, арк. 1298–1299.

[14] НГАБ. Ф. 1755, воп. 1, спр. 63, арк. 1297 адв.

[15] *Stryjkowski, M.* Kronika polska, litewska, żmódzka i wszystkiej Rusi Macieja Stryjkowskiego. – T. 2. – Warszawa: Nakład Gustawa Leona Glüksberga, 1846. – S. 65. Зрэшты, у М. Стрыйкоўскага імя Прокшы перадаецца інакш – Прора. Асэнсаванню Прокшы як падчашага садзейнічала прысутнае ў летапісе ўдакладненне, што ён Кейстуту «воду давал» (Хронікі і летапісы Беларусі. Сярэднявечча і раньнемадэрны час. – [Б. м.]: Arche-Пачатак, 2009. – С. 173). Яшчэ адзін забойца Кейстута насіў імя Білгені, але ў помніках беларуска-літоўскага летапісання ён братам Прокшы не называўся (*Лицкевич, О. В.* «Летописец великих князей литовских» и «Повесть о Подолье»: опыт комплексного критического разбора. – Санкт-Петербург: Дмитрий Буланин, 2019. – С. 428–436).

[16] Urzędnicy wołyńscy XIV–XVIII wieku. Spisy / Oprac. M. Wolski. – Kórnik: Biblioteka Kórnicka, 2007. – S. 106.

[17] Старченко, Н. Кілька зауваг про функціонування патронально-клієнтарної системи (ранньомодерна Волинь зламу XVI–XVII ст.) // Academia. Terra Historiae. Студії на пошану Валерія Смолія. – Кн. 1: Простори історії. – Київ: Ін-т історії України Національної академії наук України, ДУ «Інститут всесвітньої історії Національної академії наук України», 2020. – С. 262–263.

[18] Volumina legum. – T. 3. – Petersburg : Drukiem Jozafata Ohryzki, 1859. – S. 382; *Вінниченко, О.* Доведення шляхетства на сеймиках Руського воєводства у Вишні (XVII – середина XVIII ст.)  правова регламентація і повсякденна практика…  – С. 26; *Вінниченко, О.* Доведення шляхетства на сеймиках Руського воєводства в XVII – першій половині XVIII ст.: генеалогічні аспекти… – С. 105–106.

[19] Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie (далей – AGAD). Archiwum Warszawskie Radziwiłłów (далей – AR), dz. 25, sygn. 4069, k. 78–82.

[20] *Аляхновіч, Р. А., Рыбчонак, С. А., Шаланда, А. І.* Род Іллінічаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XV–XVI стст.: радавод, гербы, уладанні. – Мір: Музей «Замкавы комплекс “Мір”», 2015. – С. 127, 257, 277, 338.

[21] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 856, арк. 7–10 адв.; Гербоўнік беларускай шляхты. – Т. 4: Г. – Мінск: Беларусь, 2016. – С. 678.

[22] *Аляхновіч, Р. А., Рыбчонак, С. А., Шаланда, А. І.* Род Іллінічаў у Вялікім Княстве Літоўскім… – С. 127, 277.

[23] Station Станіслаў Дзядулевіч выстаўляў у якасці продка лідскіх Гурыновічаў мулу Лехіма-Бердзея Аравіна, які згадваўся ў попісах войска ВКЛ 1565 і 1567 гг. (Dziadulewicz, S. Herbarz rodzin tatarskich w Polsce. – Wilno, 1929. – S. 403), але гэта супярэчыць і выводу ад 1643 г., і храналагічнай сетцы. У сярэдзіне 1560-х гг. Ярмола і Гурын Місурычы самі былі дарослымі людзьмі, наўрад ці іх сучаснік мула Лехім-Бердзей мог быць іх продкам.

[24] М. Г. Мунехін быў дзякам вялікага князя маскоўскага Васілія III, з’яўляўся фактычным кіраўніком Пскова пасля яго далучэння да Маскоўскай дзяржавы ў 1510 г. Таксама ён вядомы як інтэлектуал, адрасат пасланняў знакамітага старца Філафея (Памятники литературы Древней Руси. Конец XV – первая половина XVI века. – Москва: Худож. лит., 1984. – С. 442–455).

[25] НГАБ. Ф. 1729, воп. 1, спр. 30, арк. 18–27 адв.; Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. – Т. 1: 1361–1598. – Санкт-Петербург: Типография Эдуарда Праца, 1863. – С. 298–299; *Wolff, J.* Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku. – Warszawa: Drukiem J. Filipowicza, 1895. – S. 519–520. Вывад Яўневічаў згадваўся ў: *Анищенко, Е. К.* Шляхта Мстиславского воеводства: Список XVIII ст. – Минск: Изд. В. Хурсик, 2013. – С. 7.

[26] НГАБ. Ф. 319, воп. 1, спр. 82, арк. 871–877; Гербоўнік беларускай шляхты. – Т. 7: З, І. – Мінск: Беларусь, 2020. – С. 226.

[27] *Чарняўскі, Ф. В.*Ураднікі (пасады, тытулы) Менскага ваяводства XVI–XVIII ст.: біяграф. давед. – Вып. 6. Ч. 1: Падстарасты судовыя гродскія, гродскія суддзі. – Мінск: Выд. В. Хурсік, 2021. – С. 222–225.

[28] Гербоўнік беларускай шляхты. – Т. 7… – С. 226; *Boniecki, A.* Herbarz polski. – T. 10. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1907. – S. 43; *Kiryk, F.* Kierdej Jan (Hryćko) z Pomorzan // Polski słownik biograficzny. – T. 12. – Wrocław et al.: Ossolineum; Wyd-wo PAN, 1966–1967. – S. 423–424; *Полехов, С. В.* Наследники Витовта. Династическая война в Великом княжестве Литовском в 30-е годы XV века. – Москва: Индрик, 2015. – С. 600–601; *Михайловський, В. М.* Еластична спільнота. Подільська шляхта в другій половині XIV – 70-х роках XVI ст. – Київ: Темпора, 2012. – С. 180–185.

[29] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 1168.

[30] Прыклады пераходу баяр і мяшчан на зямянскую службу гл.: *Глінскі, Я. С.* Уваходжанне баяраў і мяшчанаў у зямянскую супольнасць маёнтка Магільна Навагрудскага ваяводства ў XVII–XVIII стст. // Герольд Litherland. – 2019. – № 21. – С. 24–34; *Грицкевич, А. П.* Хозяйственное и правовое положение военно-служилого населения в Слуцком княжестве в XVI–XVIII вв. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. 1962 г. – Минск: Наука и техника, 1964. – С. 244–245; *Доўнар, А. Б.* Сяляне-слугі Беларусі другой паловы XVI – сярэдзіны XVIII ст. – Мінск: Беларуская навука, 2007. – С. 52–56; *Калечыц, В.* Зямяне і баяры маёнтка Койданаў Менскага павета ў XVI–XVIII стст. // Герольд Litherland. – 2021. – № 22. – С. 52–62; *Sienkiewicz, W.* Ziemianie zależni w Wielkim Księstwie Litewskim od połowy XVII do połowy XVIII wieku. Studium z dziejów feudalizmu litewskiego: maszynopis pracy doktorskiej. – Warszawa, 1982. – S. 130–135.

[31] НГАБ. Ф. 319, воп. 1, спр. 36, арк. 266 адв.; КМФ 5, воп. 1, спр. 4021, арк. 53; AGAD. AR, dz. 23, t. 122, p. 4, k. 35.

[32] НГАБ. Ф. 160, воп. 1, спр. 23, арк. 332 адв.

[33] AGAD. AR, dz. 25, sygn. 4069, k. 73, 83.

[34] НГАБ. Ф. 1787, воп. 1, спр. 2, арк. 351–352 адв.

[35] У Слонімскім павеце шляхта Корбуты валодалі зямлёй у маёнтку Вішава (НГАБ. Ф. 1785, воп. 1, спр. 16, арк. 52–52 адв.).

[36] НГАБ. Ф. 1787, воп. 1, спр. 2, арк. 473–473 адв.; AGAD. AR, dz. 23, t. 159, p. 2, k. 324–325; *Статкевіч-Чабаганаў, А. В.* Я – сын Ваш: Статкевічы, Сацкевічы-Статкевічы герба «Касцеша». Карафа-Корбуты герба «Корчак». – Мінск: Роднае слова, 2011. – С. 333–339, 483, 492, 505.

[37] НГАБ. Ф. 319, воп. 1, спр. 117, арк. 659–661 адв.; ф. 694, воп. 2, спр. 7381, арк. 6–8; AGAD. AR, dz. 23, t 137, p. 4, k. 64–67. *Скеп'ян, А. А.* Двор і слугі князёў Слуцкіх у канцы XV – 80-х гг. XVI ст. // Arche. – 2014. – № 6. – С. 330–331; *Klechta, A.* Inwentarz

księstwa słuckiego 1600 roku // Rocznik bialskopodlaski. – T. 24. – Biała Podlaska, 2016. – S. 210–229.

[38] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 1049, арк. 38–39, 47–49 адв.

[39] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 1049, арк. 40 адв., 48–48 адв.

[40] AGAD. AR, dz. 23, t. 159, p. 2, k. 324–325; *Sienkiewicz, W.* Ziemianie zależni ... – S. 180.

[41] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 1049, арк. 48, 63.

[42] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 3611, арк. 23–24 адв.

[43] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 3611, арк. 21–22, 25–26 адв.

[44] AGAD. AR, dz. 23, t. 159, p. 2, k. 301.

[45] НГАБ. Ф. 694, воп. 2, спр. 1079, арк. 63–63 адв.

[46] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 2131, арк. 1–3; ф. 1730, воп. 1, спр. 11, арк. 476–478 адв.

[47] *Błaszczyk, G.* Herbarz szlachty żmudzkiej. – T. 4. – Warszawa: DiG, 2015. – S. 237–242.

[48] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 2102, арк. 10–10 адв.

[49] *Uruski, S.* Rodzina. Herbarz szlachty polskiej. – T. 11. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1914. – S. 296–297.

[50] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 2102, арк. 10 адв.

[51] AGAD. AR., dz. 23, t. 159, p. 2; t. 160, p. 1.

[52] НГАБ. Ф. 694, воп. 2, спр. 6419, арк. 55–56 адв. Гэта толькі пералік родаў, якія жылі ў маёнтку Пагост, з пазначэннем таго, ці былі яны прызнаны зямянскімі.

[53] AGAD. AR, dz. 25, sygn. 4069, k. 64–88. У выпадку Старыцы захаваўся не толькі спіс родаў, але часткова і копіі дакументаў, якімі яны падмацоўвалі сваё паходжанне.

[54] AGAD. AR, dz. 25, sygn. 4069, k. 66.

[55] Гербоўнік беларускай шляхты. – Т. 1: А. – Мінск: БелНДІДАС, 2002. – С. 90–91; Błaszczyk, G. Herbarz szlachty żmudzkiej. – T. 2. – Warszawa : DiG, 2015. – S. 56–61.

[56] НГАБ. Ф. 160, воп. 1, спр. 23, арк. 334–335, 466; AGAD. AR, dz. 25, sygn. 4069, k. 61.

[57] Пра барацьбу за «нойбургскія валоданні» ў першай трэці XVIII ст. больш падрабязна гл.: *Мацук, А.* Барацьба магнацкіх груповак у ВКЛ (1717–1763 гг.). – Мінск: Медысонт, 2010. – С. 103–111; *Lesiński, J.* Spory o dobra neuburskie // Miscellanea Historico-Archivistica. – T. 6. – Warszawa: DiG, 1996. – S. 121–130.

[58] НГАБ. Ф. 1733, воп. 1, спр. 11, арк. 327 і далей.

[59] Пра мерапрыемствы Ганны-Кацярыны ў дачыненні да зямян гл.: *Галубовіч, В. У., Рыбчонак, С. А., Шаланда, А. І.* Чорная дама з Мірскага замка. Княгіня Ганна Кацярына з Сангушкаў Радзівіл (1676–1746). – Мір: Музей «Замкавы комплекс "Мір"», 2020. – С. 177–184.

[60] НГАБ. Ф. 1730, воп. 1, спр. 11, арк. 533–533 адв.

[61] НГАБ. Ф. 1730, воп. 1, спр. 11, арк. 517–518 адв.

[62] НГАБ. Ф. 694, воп. 2, спр. 7384, арк. 24 адв.; КМФ 5, воп. 1, спр. 1538, арк. 53; спр. 1539, арк. 33 адв.; спр. 1540, арк. 40.

[63] НГАБ. Ф. 1730, воп. 1, спр. 11, арк. 562–563 адв.; ф. 1738, воп. 1, спр. 1, арк. 229–229 адв.

[64] НГАБ. КМФ 5, воп. 1, спр. 1539, арк. 56–57 адв.; спр. 3357, арк. 23; спр. 4022, арк. 119 адв.; ф. 319, воп. 2, спр. 1465, арк. 24–25; ф. 1739, воп. 1, спр. 6, арк. 474.

[65] AGAD. AR, dz. 23, t. 159, p. 2, k. 325.

[66] НГАБ. Ф. 1730, воп. 1, спр. 11, арк. 560–561 адв.

[67] AGAD. AR, dz. 23, t. 137, p. 4, k. 65.

## АСАБОВЫ ПАКАЗАЛЬНІК


Абакановіч Ян 380
Абжалтоўскі Юзаф, каморнік шавельскі 603
Аборская Кацярына 193
Аборскі N. 57, 65
Абрамовіч N. 61
Абрамовіч Вікторыя, v. Камінская 427
Абрамовіч Казіміра, v. Каборда 25
Абрамовіч Францішка, v. Каранеўская 604
Абрамовіч Ян, возны 288
Абрампальская N. 738
Абрампальская Ганна Сымонаўна, v. Есьман 222
Абрампальскі Тадэвуш, асэсар Мінскай палаты грамадзянскага суда 444
Абрыцкая Ганна, v. Калясінская 368
Абрыцкая Кацярына, v. Калясінская 366
Абуховіч Адам, суддзя земска-павятовы мазырскі 500, 502
Абуховіч Аляксандр, палкоўнік 511
Абуховіч Ганна, v. Каменская 409
Абуховіч Зузана, v. Каліноўская 341
Абуховіч Ігнат, стольнік мазырскі 433
Абуховіч Ксаверы, старшыня 2-га Дэпартамента Мінскага галоўнага суда 112, 357
Абуховіч Філіп Юзафавіч, маршалак павятовы мазырскі 184
Абуховіч Юзаф, падваявода навагрудскі 112, 185
Абуховічы 36, 283
Абухоўская Тэрэза, v. Камінская 437
Агеева Аляксандра Пятроўна, v. Building Канановіч 460
Агінская Алена, княгіня 340
Агінская Вікторыя, v. Кавецкая 71
Агінская Марцыбэля, v. Завіша, князёўна 611
Агінская Тэрэза, v. Салагуб, князёўна 682
Агінская, нар. Завіша, N., княгіня 427
Агінскі Ігнат, кн., кашталян віленскі 340
Агінскі Казімір-Дамінік, кн., ваявода троцкі 340
Агінскі Міхал-Казімір, кн., гетман вял. літ. 302, 611, 682, 699
Агінскі Ян, кн. 427
Агінскія, князі 703
Адамовіч Алена, v. Карповіч 708
Адамовіч Анеля, v. Кавецкая 72
Адамовіч Ганна Антоніеўна, v. Карзюк 644
Адамовіч Дарота, v. Карповіч 715
Адамовіч Кацярына Францішкаўна, v. Карповіч 708
Адамовіч Марыяна Станіславаўна 646
Адамовіч Марыяна, v. Каверская 65
Адамовіч Рэгіна, v. Карабановіч 558
Адамовіч Станіслаў Аўгустынавіч 646
Адамовіч Тэрэза, v. Карчэўская 748
Адамовіч Фаўстына, v. Карабановіч 559
Адамовіч, нар. Гадлеўская, Разалія Францішкаўна, 2 v. Камоцкая 445
Адахоўская Пятрухна, v. Камароўская 379
Адахоўскі Міхал 379
